

# РАЗМАЎЛЯЙ ПА-БЕЛАРУСКУ!

# ДАРАГІЯ СЯБРЫ!

**Кожная нацыя мае сваю ўласную культуру, мову, гісторыю, і не толькі мае, але і шануе, карыстаецца ды любіць. А ў беларусаў так склалася, што спрадвеку суседзі і з захаду, і з усходу акупавалі нашу тэрыторыю і ўводзілі сваю мову, насаджалі сваю культуру. І менавіта з-за гэтых падзей зараз мы дайшлі да занядбання мовы, адрачэння ад культуры і так званага перапіса гісторыі... .**

**І цяпер напрошваецца пытанне: "Колькі гэта будзе працягвацца?"**

*Ці ж мы хлопцы рук не маем?*
*Ці ж нам сілы Бог не даў?*
*Ці ж над родным нашым краем,*
*Прамень волі не блішчаў?*
*Я.Колас*

**Не ў нашых сілах прымаць розныя дэкларацыі і законы, бо мы просты народ, які нічога не вырашае, але ў нашых сілах сказаць "ТАК" роднай культуры і мове.**

**Мы не кажам, што трэба нешта забіваць, зачыняць ці знішчаць, а карыстаемся прынцыпам:**

*Любіш сваё, зразумей і чужое,*
*Любіш чужое, шануй і сваё.*
*Л.Вольскі*

**14 мая пройдзе Рэспубліканскі дзень роднай культуры. У гэты дзень мы просім Вас паспрабаваць паразмаўляць на беларускай мове, няважна якой якасці будзе гутарка, нават трасянка. Галоўнае, што Вы паспрабуеце. Таксама раім у гэты дзень наведаць які-небудзь беларускі тэатр, канцэрт ці вечарыну.**

**Гэтым крокам мы выкажам павагу не толькі роднай культуры, але і да людзей, якія стваралі яе для нас.**

---

***БАМГА “Дзедзіч”***
*Цэнтр роўнага навучання • Тэл. (029) 724-21-16*
*Наклад 7000 ас. • Надрукавана на ксераксе*